Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02

DOI:10.17951/sb.2025.19.207-226
Studia Białorutenistyczne 19/2025 LINGUISTICS
ISSN: 1898-0457 e-ISSN: 2449-8270 Licence: CC BY 4.0

Nadzieja Shakun

Independent researcher (Belarus)
e-mail: nieshta@gmail.com
https://orcid.org/0000-0002-4743-3538

Пакаленне зумераў і беларуская мова

Generation Z and the Belarusian Language

Pokolenie Z a język białoruski

Abstract

This article presents a fragment of sociolinguistic fieldwork of the current language situation in Belarus in a small segment, namely among young people aged 16 to 20 (the so-called Generation Z), high school students and first-year university/college students who are currently residing in Belarus. The author of the article, using an anonymous questionnaire in the Google Form, found out whether the Belarusian language is present in the daily life of young people and what role it plays for them, how often they encounter it and in which areas of socio-cultural life (in particular, in the family, among friends and acquaintances, in classes at an educational institution), whether the new generation passes on the old stereotypes about the language and how the Belarusian language is presented in social networks TikTok and Instagram the eyes of representatives of Generation Z. This study in this aspect is conducted for the first time in conditions of limited research opportunities (the author is an independent researcher in Belarus, for whom it is not easy to gain access to potential respondents in target focus groups).

Keywords: language situation in Belarus, Belarusian language, sociolinguistic research, Generation Z

Abstrakt

W artykule przedstawiono fragment socjolingwistycznego badania terenowego obecnej sytuacji językowej na Białorusi w niewielkim segmencie, mianowicie wśród młodzieży w wieku od 16 do 20 lat (tak zwane pokolenie Z), uczniów szkół średnich i studentów pierwszego roku studiów wyższych, którzy obecnie przebywają na Białorusi. Autor artykułu, za pomocą

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02

anonimowej ankiety w formularzu Google, dowiedział się, czy język białoruski jest obecny w życiu codziennym młodych ludzi i jaką rolę odgrywa, jak często się z nim stykają i w jakich obszarach życia społeczno-kulturalnego (w szczególności w rodzinie, wśród bliskich przyjaciół i znajomych, na zajęciach w placówce edukacyjnej), czy nowe pokolenie przekazuje dawne stereotypy na temat języka i w jaki sposób język białoruski jest prezentowany w sieciach społecznościowych TikTok i Instagram oczami przedstawicieli pokolenia Z. Niniejsze badanie w danym aspekcie jest prowadzone po raz pierwszy w warunkach ograniczonych możliwości badawczych (autor jest niezależnym badaczem na Białorusi, dla którego nie jest łatwo uzyskać dostęp do potencjalnych respondentów w docelowych grupach fokusowych).

Słowa kluczowe: sytuacja językowa na Białorusi, język białoruski, badanie socjolingwistyczne, pokolenie Z

Анатацыя

У дадзеным артыкуле прадстаўлены фрагмент палявога сацыялінгвістычнага даследавання актуальнай моўнай сітуацыі ў Беларусі ў невялікім сегменце, а менавіта сярод маладых людзей ва ўзросце ад 16 да 20 гадоў (так званае пакаленне зумераў), старшакласнікаў і першакурснікаў універсітэта / каледжа, якія ў дадзены момант знаходзяцца ў Беларусі. Аўтарка артыкула праз правядзенне ананімнага апытання ў гугл-форме высвятляла, ці прысутнічае беларуская мова ў штодзённым жыцці маладых людзей і якую ролю яна для іх адыгрывае, як часта яны сутыкаюцца з ёй і ў якіх менавіта сферах сацыяльна-культурнага жыцця (у сям'і, у коле сяброў і знаёмых, на занятках у навучальнай установе), ці транслюе новае пакаленне старыя стэрэатыпы пра мову, а таксама як мова прадстаўлена ў сацыяльных сетках TikTok і Instagram вачыма зумераў. Дадзенае даследаванне ў такім ключы праводзіцца ўпершыню ва ўмовах абмежаваных даследчых магчымасцей (аўтарка з'яўляецца ў Беларусі незалежнай даследчыцай, для якой няпроста атрымаць доступ да патэнцыйных рэспандэнтаў у мэтавых фокус-групах).

Ключавыя словы: моўная сітуацыя ў Беларусі, беларуская мова, сацыялінгвістычнае апытанне, пакаленне зумераў

Калісьці я натрапіла на такое меркаванне: "Дакладнасць, правільнасць апісання той ці іншай моўнай сітуацыі залежыць не толькі ад колькасці і значнасці прыцягненых да аналізу канкрэтных фактаў і выбару рэлевантных прыкмет, неабходных для яе апісання, але і ад здольнасці даследчыка зірнуць на дадзеную сітуацыю адстаронена, незалежна ад папярэдняга досведу і ўсталяванага меркавання" (Kuznecova, 2000, s. 18). Паглядзець на моўную сітуацыю ў Беларусі адстаронена, з боку, без уліку сталых стэрэатыпаў заўсёды было цяжка беларускаму даследчыку ці даследчыцы, бо гэта тэма была і застаецца надзвычай адчувальнай, а даследчыкі беларускай мовы ўразлівыя. Вядома, гэта траўматычны досвед – даследаваць прычыны знікнення сваёй мовы, цяжка прамовіць, што шмат хто з маладога пакалення ведае англійскую нашмат лепей за родную і чытае класічную беларускую літаратуру са слоўнікам,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02

калі ўвогуле чытае. Ніна Мячкоўская ў артыкуле *Сціплае абаянне акадэмізму: сацыялінгвістычныя матывы на старонках "Беларускай лінгвістыкі" (1986–1996)* заўважае: "Несуцяшальны дыягназ моўнай сітуацыі гучыць у кожным артыкуле з тых, што закранаюць сацыялінгвістычныя пытанні. Дыягназ відавочны, але ўсё ж лічбы перакрываюць любы ўласны адмоўны вопыт..." (Mâčkoŭskaâ, 1998, s. 73) – і далей прыводзіць дадзеныя па скарачэнні колькасці школ з беларускай мовай навучання, беларускамоўнай прэсы і праграм на тэлебачанні і радыё, а таксама спасылаецца на дадзеныя анкетавання ў малых гарадах, праведзенага Т.Кузьмянковай, паводле якіх 94,6% іх насельніцтва лічыць роднай мовай беларускую, але пры гэтым 84,17% карыстаюцца ў штодзённай камунікацыі рускай. Так, лічбы бянтэжаць, але Н. Мячкоўская папракае беларускіх лінгвістаў за тое, што ў акадэмічным друку сацыялінгвістычныя калізіі акрэсліваюцца, але для іх глыбокага даследавання не стае "прафесійнай метадычнасці і глыбіні прычынна-гістарычнага тлумачэння" (Mâčkoŭskaâ, 1998, s. 76). Наўрад ці справядліва вінаваціць навукоўцаў у адсутнасці аб'ёмных і глыбокіх сацыялінгвістычных даследаванняў, бо ў Беларусі рабіць гэта складана па розных прычынах.

Сумны факт: здабыць у цяперашніх умовах функцыянавання беларускага грамадства аб'ектыўныя дадзеныя ў галіне сацыялінгвістыкі амаль немагчыма. Гэта звязана з шэрагам рэальных перашкод: напрыклад, у Беларусі з 2021 года дзейнічае Закон аб абароне персанальных даных (Zakon Rèspublìkì Belarus′), які не дазваляе неўпаўнаважаным асобам / інстытуцыям праводзіць збор і апрацоўку дадзеных фізічных асобаў, якія могуць быць ідэнтыфікаваныя праз гэтыя дадзеныя. На практыцы гэта азначае, што маштабныя сацыялагічныя (у тым ліку і сацыялінгвістычныя) апытанні і анкетаванні з персанальнымі дадзенымі апытаных могуць цяпер праводзіць пераважна заангажаваныя дзяржаўныя органы. Да таго ж, сам аб'ект даследавання – беларуская мова – можа выклікаць насцярожанасць патэнцыйнай аўдыторыі. Шмат хто зараз адмаўляецца ўдзельнічаць у апытаннях, звязаных наўпрост ці ўскосна з нацыянальным пытаннем і з моўнай палітыкай, адчуваючы трывогу, дыскамфорт. Таму калегі-лінгвісты, якія зараз працуюць у Беларусі, скептычна выказваюцца пра любыя палявыя даследаванні моўнай сітуацыі: у такіх умовах правесці іх з прыцягненнем вялікай аўдыторыі выглядае мала рэальным.

Бытуе таксама меркаванне, што сацыялінгвістычныя даследаванні ў Беларусі заўсёды адлюстроўваюць не столькі аб'ектыўны стан мовы, колькі жаданы, такі, які б хацелася бачыць. Бо беларуская мова, пры тым, што не ўжываецца актыўна ў грамадстве, так бы мовіць, увесь час рамантызуецца беларусамі, гэта наш "козыр" на ўсякі выпадак, які мы можам у крытычны момант дастаць з рукава і прадставіць у якасці жалезнага маркера сваёй нацыянальнай ідэнтычнасці. Тут варта прыгадаць вынікі перапісу насельніцтва незалежнай Беларусі 1999 года, калі 85,6% апытаных назвалі беларускую мову роднай і 41,3% сказалі, што пераважна

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02

на ёй размаўляюць дома, што відавочна не адпавядала рэчаіснасці. Ведаю некалькі кейсаў, калі ўдзельнікі перапісу адказвалі, што мовай хатніх зносін у іх з'яўляецца беларуская, аднак у сям'і заўсёды размаўлялі па-руску. Паўстае пытанне: навошта шмат хто сярод тых 41,3% фактычна сказілі рэчаіснасць? Можна меркаваць, што на той час гэта было стратэгічным адказам. Многія ўсведамлялі, што дамінаванне рускай мовы ў грамадстве, пацверджанае "лічбамі на паперы", дасць магчымасць чыноўнікам праводзіць сваю "моўную палітыку", паступова скарачаючы прысутнасць беларускай мовы ў школьнай адукацыі і ў іншых сферах культурна-сацыяльнага жыцця беларусаў (Tokc′, 2018, s. 48). Той "моўны" фрагмент у перапісе можна назваць сацыялінгвістычным даследаваннем. Як ацаніць яго вынікі? Яно правалілася, бо паказала сфальшываваныя дадзеныя, ці якасна спрацавала, бо паказала рэальнае стаўленне да мовы і яе ролі ў грамадстве?

Вяртаючыся да слоў Кузняцовай, паспрабую асцярожна адказаць на пытанне, ці існуе ўніверсальная аб'ектыўнасць і поўная адстароненасць для сацыялінгвіста. На маю думку, гэта наўпрост залежыць ад мэтаў і матэрыялу кожнага канкрэтнага даследавання. Пагадзіцеся, што ў даследаваннях, якія працуюць з меркаваннямі асобных індывідуумаў з розным бэкграўндам у розных кантэкстах, мэта якраз выявіць суб'ектыўнае бачанне моўнай сітуацыі, не прыводзячы яго да агульнага "аб'ектыўнага" назоўніка. Пра суб'ектыўны погляд на моўную сітуацыю пісалі Сяргей Запрудскі (Zaprudskì, Laŭžal′, 1998, s. 56), Алена Лянкевіч (Lânkevìč, 2014). Напэўна, сацыялінгвістычныя даследаванні, заснаваныя на колькасных метадах, адносна "вымяральных", прэтэндуюць на большую аб'ектыўнасць. Аднак вывучэнне мовы ў жывым соцыуме непазбежна вядзе да ўсведамлення, што кожны асобны моўца-рэспандэнт мае сваю карціну рэчаіснасці, адпаведна з якой ён ці яна інтэрпрэтуе пытанні, што ставіць перад ім інтэрв'юер. Пры гэтым і сам інтрэв'юер не застрахаваны ад заангажаванасці ў пэўную канцэпцыю, якая змусіць яго паглядзець па прадмет даследавання пад адпаведным вуглом. Або даследчык ці даследчыца міжволі транслююць пункт гледжання, што дамінуе ў іх камунікацыйным коле, а з яго ён ці яна пераважна і атрымліваюць інфармацыю пра моўную рэчаіснасць (тут я маю на ўвазе, што беларускамоўныя даследчыкі часта ствараюць сваё камернае беларускамоўнае культурна-сацыяльнае асяроддзе, і калі ў ім шмат такіх жа беларускамоўных з розных сфер жыцця – свой беларускамоўны цырульнік, свой беларускамоўны сямейны доктар і г.д., то вялікая рызыка зрабіць праекцыю і на "вонкавы" свет). Ці павінен гэты аспект суб'ектыўнасці, заангажаванасці спыняць лінгвіста ад даследавання моўнай сітуацыі ў сучаснай Беларусі? Не думаю. Якраз наадварот: такія працы могуць быць карысныя для разумення ў тым ліку настрою ў прафесійным асяроддзі, а таксама для фіксацыі таго, у якіх умовах, з якімі даступнымі інструментамі працуе навуковец у гэты час, куды ён глядзіць і што ён бачыць.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02

У дадзеным даследаванні на моўную сітуацыю ў цяперашняй Беларусі я пагляджу не як эксперт, бо сацыялінгвістыка не знаходзіцца ў полі маёй экспертызы, а як непасрэдная сведка “вонкавых” падзей.

Перш за ўсё акрэслю сваё тэматычнае і геаграфічнае поле, а таксама мэты гэтага эксперыменту.

Тут я прадстаўлю невялікі фрагмент рэчаіснасці: мяне цікавіць, як сучасныя прадстаўнікі пакалення зумераў, што знаходзяцца цяпер на тэрыторыі Беларусі, ставяцца да беларускай мовы і ў якой ступені яны карыстаюцца ёй у сваім штодзённым жыцці. Адразу патлумачу, чаму аўдыторыя для назірання – пакаленне зумераў. Бо гэта ўласна тая аўдыторыя, з якой я зараз шчыльна працую як прыватная настаўніца беларускай мовы, а значыць, ведаю на практыцы ў жывым часе. Да зумераў адносяць тых, хто нарадзіўся прыкладна паміж 1995–2010-ым ці, паводле іншага вымярэння, паміж 1997–2012 гадамі. У маім даследаванні я звузіла аўдыторыю да ядра зумераў і падлучыла да дыялогу тых, хто нарадзіўся ў 2005–2009 годзе. Адпаведна маім суразмоўцам на момант апытання было ад 16 да 20 гадоў. Цяпер гэта вучні старшых класаў беларускай школы (10–11 клас), выпускнікі і студэнты 1–2 курса ўніверсітэта ці каледжа. Яшчэ адной матывацыяй даследаваць моўную сітуацыю пераважна сярод старшакласнікаў было тое, што гэта нячастая аўдыторыя ў сацыялінгвістаў. Прыгадаю, што ў А. Лянкевіч адна фокус-група ў яе дысертацыйным даследаванні прадстаўляла школьнікаў ва ўзросце 11–13 гадоў (Lânkevìč, 2014, s. 38). А значна часцей рэспандэнтамі абіраюцца студэнты і дарослыя, якія працуюць (Paŭloŭskaâ, 2008; Mel′nikova, 2007; Woolhiser, 2013). Магчыма, таму што тынэйджары яшчэ не зусім свядомыя рэспандэнты, магчыма, не гатовыя ўзважана і адказна ставіцца да зместу апытання / інтэрв’ю? Насуперак такому погляду выкажу сваё меркаванне: цяперашняе пакаленне школьнікаў глыбока “алічбаванае”, эфектыўна абменьваецца інфармацыяй са штучным інтэлектам, актыўна выкарыстоўвае ў навучанні разнастайныя сучасныя адукацыйныя інструменты, кшталту ментальнай мапы, квізлетаў, выконваюць тэсты рознага фармату, удзельнічаюць у case-study, праходзяць вебінары, модульнае і дыстанцыйнае прафесійнае навучанне, таму добра разумеюць змест і структуру любога тэста ці інтэрв’ю, а запаўненне розных анкетаў ці апытанняў трывала ўвайшло ў іх культуру. Але пры гэтым яны яшчэ не з’яўляюцца носьбітамі ўсталяваных дарослым грамадствам стэрэатыпаў, выразна дыстанцыяваныя ад старэйшага пакалення і вялікі аб’ём інфармацыі атрымліваюць не “вертыкальна”, а “гарызантальна”. Яшчэ вельмі важнай асаблівасцю штодзённага жыцця гэтага пакалення з’яўляецца іх бытаванне ў сацыяльных сетках, якія даюць ім грандыёзны інфармацыйны ахоп і геаграфічна, і тэматычна. З аднаго боку, сацыяльныя сеткі транслююць трэнды, але з іншага – яны дазваляюць выбіраць і спажываць свой прадукт без пэўных адрасных абмежаванняў (за

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02

выключэннем толькі тых абмежаванняў, якія ўсталявала сама сетка). Для тэмы ўжывання беларускай мовы гэта вельмі істотны момант, бо калі беларуская мова робіцца трэндавай, то яе распаўсюджанне ідзе без перашкод, забараніць размаўляць на ёй у TikTok ці Instagram немагчыма, прынамсі зараз. Выбар весці свой блог па-беларуску ці не, падпісвацца на беларускамоўны кантэнт ці не – гэта толькі прыватны выбар канкрэтнага карыстальніка. Нават бацькі ў гэтым сэнсе наўрад ці паўплываюць на рашэнне дзіцяці. Культура сучаснай моладзі транслюе, што "хаця ж бы ў сацсетках я раблю што хачу".

Такім чынам, мне як даследчыцы цікава, ці заўважаюць сучасныя маладыя людзі беларускую мову ў такіх складаных грамадска-гістарычных умовах, зусім не спрыяльных для ўмацавання яе пазіцый; ці даюць ёй месца ў сферы сваіх зацікаўленняў; якія ацэначныя катэгорыі зараз бытуюць у дачыненні да роднай мовы сярод прадстаўнікоў пакалення зумераў (інакш кажучы, ці ведаюць яны старыя стэрэатыпы, што на беларускай мове размаўляюць або калгаснікі, або апазіцыянеры); як яны бачаць праблему "нежыццёвасці" нацыянальнай мовы.

Адразу апраўдаюся, што на вялікую маштабнасць даследавання я не замахваюся, бо, як і ўсе незалежныя навукоўцы, маю зараз вельмі абмежаваны доступ да патэнцыйных рэспандэнтаў, а тая фокус-група, якую ўдалося сабраць, транслюе бачанне моўнай сітуацыі ў рэчышчы, так бы мовіць, "наіўнай", ці "народнай" лінгвістыкі (Mâčkoŭskaâ, 2012).

Асноўным інструментам збору дадзеных для адказу на вызначаныя вышэй даследчыя пытанні я зрабіла анкетаванне ў форме Google-апытанкі. Сама апытанка была абсалютна ананімная, у форме была выключаная опцыя збору электронных адрасоў, у рэспандэнтаў не збіралася персанальная інфармацыя, якая магла б іх ідэнтыфікаваць (не трэба было пазначаць імя, месца жыхарства / навучання). Распаўсюджвалася анкета ў асноўным праз прыватныя каналы: найперш праз калег, настаўнікаў-рэпетытараў, якія прасілі прайсці апытанне сваіх вучняў; непасрэдна праз маіх вучняў; а таксама праз тэматычны тэлеграм-канал для вучняў старшых класаў беларускіх школ (тэма канала – падрыхтоўка да ЦЭ па беларускай мове, колькасць удзельнікаў каналу на дзень размяшчэння спасылкі на апытанку – 300).


У апытанні ўзялі ўдзел 70 рэспандэнтаў (гэта тыя, што пагадзіліся), але ў працу былі ўзяты толькі 67 анкет (3 анкеты не былі ўлічаныя, бо рэспандэнты не трапілі ў фокус-групу па ўзроставым крытэрыі). Таксама важна адзначыць, што апытанне ахоплівала пераважна незнаёмую мне аўдыторыю. Я не мела інфармацыі ні пра навучальную ўстанову, ні пра грамадзянскую пазіцыю рэспандэнтаў. З усіх удзельнікаў толькі 4 ведалі мяне асабіста як сваю настаўніцу-рэпетытарку (але і яны не мелі ўяўлення пра мэты анкетавання), астатнія былі не знаёмыя са мной увогуле. Геаграфічны ахоп аўдыторыі не можа быць вызначаны дакладна, бо ў анкеце не было пытання пра месца жыхарства / навучання, аднак па лакалізацыі калег, з якімі я дзялілася анкетай, можна меркаваць,

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02


што ў апытанні паўдзельнічалі ў асноўным вучні і студэнты горада Мінска і Мінскай вобласці, а таксама ад 5 да 10 чалавек з горада Гродна і горада Брэста. Да апытання мэтанакіравана не падлучаліся навучэнцы беларускамоўных гімназій з прычыны іх магчымай заангажаванасці ў канцэпцыю прасоўвання мовы, а значыць, стварэння "жаданай" рэальнасці.

У апытанцы для адказу было прапанавана 15 тэматычных пытанняў, дадаткова рэспандэнтаў прасілі пазначыць свой узрост і гендар. Пункт "узрост" быў выключна фільтруючым інструментам, бо ўлічваліся анкеты апытаных ва ўзросце ад 16 да 20 гадоў. Амаль палова ўдзельнікаў, 46,3%, мела 17 гадоў; трохі болей за 22% – 18 гадоў; 16,4% – 16 гадоў; менш за ўсё было рэспандэнтаў 19 і 20 гадоў, адпаведна 9% і 6% (гл. малюнак 1).

Пункт "пол" у гэтым даследаванні не працаваў на істотныя даследчыя высновы, а хутчэй дэманстраваў актыўнасць аўдыторыі ў гендарнай карэляцыі: жанчыны, як правіла, ахвотней удзельнічаюць у сацыяльна значных праектах, лягчэй адгукаюцца на ініцыятывы, якія не даюць ім матэрыяльнага прадукту, а маюць толькі гуманітарнае значэнне. У дадзеным апытанні рэспандэнтаў жаночага полу было 68,7%. Такім чынам, дзяўчыны сапраўды адгукнуліся больш



Малюнак 1.



Малюнак 2.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02

актыўна, хаця, напрыклад, у тэлеграм-канале, дзе размяшчалася спасылка на апытанку, было падпісана шмат хлопцаў (гл. малюнак 2).

Само ядро апытанкі – гэта 15 тэматычных пытанняў з прапанаванымі варыянтамі адказаў з магчымасцю выбраць адзін варыянт (толькі ў пытанні №13 "Чаму, на вашу думку, беларусы масава не пераходзяць на беларускую", апрача прапанаваных варыянтаў, была ўведзена опцыя "Іншае", дзе можна было запісаць свой варыянт адказу). Прыводжу поўны спіс пытанняў з варыянтамі адказаў:

1) Якая мова ў вас асноўная ў штодзённай камунікацыі?
• беларуская
• руская
• абедзве ў аднолькавай ступені
2) На якой мове вы размаўляеце з бацькамі?
• на беларускай
• на рускай
• на трасянцы
• з рознымі бацькамі на розных мовах
3) На якой мове вы размаўляеце з блізкімі сябрамі?
• на рускай
• на беларускай
• з рускамоўнымі – на рускай, з беларускамоўнымі – на беларускай
4) Ці вывучаеце / вывучалі вы беларускую мову ў школе?
• так
• не
5) Ці добра вы разумееце беларускую мову?
• так, добра (чытаю і пішу без слоўніка)
• не вельмі добра (разумею толькі асноўны сэнс, некаторыя словы трэба перакладаць)
• амаль не разумею (не магу самастойна напісаць тэкст па-беларуску, чытаю са слоўнікам)
6) Калі вам трэба напісаць тэкст па-беларуску, вы
• пішаце яго самі адразу па-беларуску
• пішаце па-руску і робіце электронны пераклад
• просіце AI напісаць вам тэкст па-беларуску
7) Ці ёсць у вашым коле сяброў / знаёмых беларускамоўныя?
• так, але няшмат (1–2 чалавекі)
• так, даволі многа (3–5 чалавек)
• у мяне ў асноўным беларускамоўныя
• не, зусім няма беларускамоўных
8) Дзе вы часцей чуеце беларускую мову?
• толькі на занятках мовы і літаратуры
• на занятках і па-за заняткамі, у мяне ёсць беларускамоўныя сябры

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02

• дома, у мяне беларускамоўная сям'я
• я спецыяльна шукаю беларускамоўных, каб практыкаваць мову

9) Ці часта трапляецца вам беларускамоўны кантэнт у сацыяльных сетках TikTok і Instagram?

• вельмі рэдка, нават не памятаю, калі апошні раз штосьці траплялася па-беларуску
• не вельмі часта, але трапляецца
• часта, кожны раз, як гартаю стужку

10) Ці падпісваецеся вы на беларускамоўных блогераў, таму што кантэнт цікавы (і не важна, на якой ён мове)?

• не
• так

11) Ці падпісваецеся вы на беларускамоўных блогераў толькі таму, што яны вядуць свой блог па-беларуску (каб падтрымаць мову)?

• не
• так

12) На вашу думку, ці павялічылася апошнім часам колькасць беларускамоўнай моладзі?

• так, зараз я часцей чую беларускую
• не, нічога не памянялася
• не, наадварот паменшылася

13) Чаму, на вашу думку, беларусы масава не пераходзяць на беларускую?

• проста не ведаюць яе
• выбіраюць мову, на якой размаўляе большасць
• саромеюцца, бо на беларускай размаўляць зашкварна
• іншае (ваш варыянт)

14) Дзе прасцей перайсці на беларускую?

• у вялікім горадзе, бо тут больш магчымасцяў
• у вёсцы, бо тут старэйшае пакаленне размаўляе па-беларуску ці на дыялекце
• няма розніцы, цяпер усюды аднолькавыя магчымасці

15) Калі вы завялі блог па-беларуску, то гэта, хутчэй за ўсё, таму што

• мы беларусы павінны папулярызаваць родную мову
• зараз гэта трэндава, гэта выдзеліць мой блог
• гэта прыцягне патрэбную мне аўдыторыю
• ніколі не буду весці блог па-беларуску

Як бачна, канцэпцыя пытанняў звязана з аспектам прысутнасці мовы ў жыцці маладых людзей – у прыватнасці, у іх блізкім коле (бацькі, сябры, аднакласнікі) і ў віртуальнай рэальнасці (сацсеткі TikTok і Instagram), а таксама з ацэначным аспектам – з дамінуючымі канатацыямі, якія зараз бытуюць у дачыненні да мовы менавіта сярод прадстаўнікоў пакалення зумераў. Цікава было высветліць, ці заўважную пазіцыю зараз займае беларуская мова для моладзі, ці атрымалі яны

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02

ў спадчыну ад папярэдніх пакаленняў старыя стэрэатыпы пра беларускую мову або пазбавіліся іх / набылі свае. Яшчэ адно ключавое пытанне ў анкеце – пытанне, звязанае з праекцыяй на будучыню мовы: ці змяшчаюць яе зумеры ў сваю карціну перспектыўнай рэчаіснасці?

На першае пытанне пра мову штодзённай камунікацыі 91% адказалі, што карыстаюцца рускай, 9% – двухмоўныя, ніхто з апытаных не з'яўляецца выключна беларускамоўным (гл. малюнак 3), таму можна прагназаваць, што яны транслююць погляд на моўную сітуацыю хутчэй звонку, чым з сярэдзіны. Пры гэтым на беларускай з бацькамі размаўляюць 2 рэспандэнты, або 3% (гл. малюнак 4), астатнія або на рускай (56 чалавек, ці 83,6%), або на трасянцы (9 чалавек, ці 13,4%), але ёсць і такія, хто размаўляе з бацькамі на рускай, а з блізкімі сябрамі на беларускай: такіх таксама двое, або 3% (гл. малюнак 5). Большасць апытаных з сябрамі размаўляюць па-руску – іх 50, але даволі шмат абралі трэці варыянт – яны з рускамоўнымі ўжываюць рускую, а з беларускамоўнымі пераходзяць на беларускую (так адказалі 15 з 67 апытаных).

Усе 100% вывучаюць ці вывучалі беларускую мову ў школе. Аднак толькі 65,7% разумеюць яе добра, пішуць і чытаюць па-беларуску без слоўніка. 31,3% разумеюць беларускую не вельмі добра: для поўнага разумення сэнсу ім



Малюнак 3.



Малюнак 4.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02



Малюнак 5.



Малюнак 6.

патрэбны частковы пераклад са слоўнікам. І толькі 2 рэспандэнты (3%) адказалі, што амаль не разумеюць беларускую і не здольны самастойна напісаць на ёй тэкст ці чытаць без слоўніка (гл. малюнак 6). Гэта сведчыць пра даволі высокі ўзровень валодання мовай у межах дадзенай фокус-групы.

Наступнае пытанне фактычна было кантрольным для папярэдняга, яно высвятляла, ці карыстаюцца рэспандэнты мовай на практыцы, калі дэкларуюць, што свабодна ёй валодаюць. І праверка спрацавала станоўча: тыя ж 65,7% апытаных адказалі, што калі ім трэба стварыць тэкст па-беларуску, то яны



Малюнак 7.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02

пішуць яго самастойна (гл. малюнак 7). Тым не менш, трошкі больш за 25% усё-ткі пішуць спачатку тэкст па-руску, а потым перакладаюць яго з дапамогай электроннага перакладчыка, а 6 чалавек, ці 9%, увогуле звяртаюцца да штучнага інтэлекту. У гэтым выпадку можна бачыць хутчэй не адлюстраванне кепскага валодання мовай, а нежаданне ці няздольнасць пісаць самастойна любы тэкст увогуле. І тут ёсць станоўчы момант: сам штучны інтэлект, дзякуючы запытам на напісанне тэксту па-беларуску, апрацоўвае і назапашвае інфармацыю ды ўдасканальвае свае навыкі беларускага маўлення.

Сітуацыя з колькасцю беларускамоўных у камунікацыйным коле прадстаўнікоў фокус-групы, па дадзеных апытання, выглядае даволі аптымістычна. Толькі чвэрць, а дакладней 26,9% рэспандэнтаў, не маюць беларускамоўных сяброў і знаёмых. Адпаведна 73,1% камунікуюць з беларускамоўнымі, прычым у 10 апытаных іх даволі многа – 3–5 чалавек (гл. малюнак 8). Наступнае пытанне было кантрольным да папярэдняга, яго мэтай было спраўдзіць, ці сапраўды рэспандэнты чуюць беларускую па-за заняткамі мовы і літаратуры. І тут якраз адказы канфліктуюць з папярэдняй дыяграмай. Пры тым, што папярэдне 49 рэспандэнтаў агулам сцвярджалі, што маюць беларускамоўных знаёмых, на пытанне “Дзе часцей вы чуеце беларускую мову?” толькі 34 выбралі варыянты “на занятках



Малюнак 8.




Малюнак 9.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02

і па-за заняткамі, у мяне ёсць беларускамоўныя сябры" і "я спецыяльна шукаю беларускамоўных сярод знаёмых, каб практыкаваць мову" (гл. малюнак 9). Цяжка дакладна патлумачыць такое разыходжанне, аднак можна выказаць здагадку, што частка з тых 49-ці маглі пазначыць, што маюць беларускамоўных знаёмых, улічыўшы тых, каго яны проста ведаюць, але не знаходзяцца з імі ў камунікацыі.

Найбольш цікавай, падаецца, была частка апытання, датычная беларускай мовы ў сацыяльных сетках. Пераважная большасць апытаных чуе беларускамоўны кантэнт ад блогераў і ў TikTok, і ў Instagram, аднак не так часта (гл. малюнак 10). Гэтым пытаннем я, у тым ліку, параўноўвала ўласны досвед з досведам рэспандэнтаў. Я з'яўляюся пасіўнай карыстальніцай абедзвюх сетак, гляджу, але не вяду сама блог. Дзеля чысціні эксперыменту я не адзначала ў наладах ніякіх сваіх зацікаўленняў / прыярытэтаў, я не падпісвалася ні на якіх блогераў і не ставіла "падабаецца" ні на якія відэа, так што я намагалася ніяк не "фільтраваць" сваю стужку. Але апошнім часам мне трапляюцца беларускамоўныя блогеры даволі часта, кожны раз, як я гартаю стужку. Тут не выпадае рабіць нейкія аб'ектыўныя вымярэнні частотнасці, бо алгарытмы сацсетак працуюць выпадкова (ці невыпадкова?), але можна казаць пра суб'ектыўныя адчуванні і досвед рэальнага фрагменту рэчаіснасці (без закладзеных заканамернасцяў). Так, напрыклад, гартаючы стужку ў TikTok цягам 8 хвілін і праглядаючы ўсе відэа прыкладна аднолькавы час, 6–7 секунд, я вяла падлік, на якой мове колькі відэа мне трапілася. Я не ўлічвала толькі рэкламу. І мне трапілася 36 відэа па-руску, 12 – па-англійску, 3 – па-ўкраінску, 1 было на карэйскай, 6 – на беларускай мове. З гэтых 6 беларускамоўных відэа 2 былі ад блогераў, якіх я ўжо ведаю (адзін вядзе кулінарны блог, іншая – бытавы, штодзённае жыццё), астатнія ад невядомых мне блогераў, сярод іх кантэнт розны – чытанне вершаў па-беларуску, святы (здымалі вяселле), штодзённае жыццё. Такім чынам, я магу прыяднацца і да 64,2% і да 7,5%, бо ўспрыняцце паняцця "часта" ў гэтым сегменце даволі суб'ектыўнае.


Ключавыя пытанні гэтага тэматычнага блоку тычыліся карыстальніцкіх паводзін апытаных. Было цікава даведацца, ці гатовыя яны ў віртуальнай рэальнасці, дзе, як мы памятаем, яны пачуваюцца даволі свабодна і самастойна,



Малюнак 10.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02

адвакатаваць беларускую мову, а значыць, падпісвацца на беларускамоўны кантэнт не таму, што ён цікавы, а толькі дзеля таго, каб падтрымаць саму мову. І тут маладыя людзі прадэманстравалі сваю прагматычнасць. Пераважная большасць гатовыя падпісвацца на беларускамоўных блогераў, але толькі пры ўмове, што ім цікавы іх кантэнт, аднак рабіць гэта толькі дзеля падтрымкі і прасоўвання мовы яны не будуць. Параўнайце адказы рэспандэнтаў на малюнках 11 і 12. На маю думку, гэта сведчыць пра тое, што мова для пакалення зумераў наўрад ці з'яўляецца рамантычным сімвалам нацыянальнага адраджэння, які трэба ахоўваць, апекавацца ім, клапаціцца пра яго імідж і намагацца прасунуць у сацыяльным асяроддзі. Яны найхутчэй глядзяць на любую мову больш інструментальна, чым іх бацькі. Калі ім цікавы кантэнт, то яны будуць яго слухаць на любой мове, і беларуская большасці не зашкодзіць. Аднак ахвяраваць "тэматычнай структурай" сваёй стужкі дзеля ідэі адвакатавання мовы яны не будуць. Цяжка ацэньваць такі падыход са станоўчага/адмоўнага боку. Безумоўна, засмучае тое, што новае пакаленне пакуль не мысліць катэгорыямі каштоўнасці нацыянальнай культуры і мовы, але, з іншага боку, іх прагматычны падыход дазваляе пазбавіцца старых шкодных стэрэатыпаў.



Малюнак 11.



Малюнак 12.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02



Малюнак 13*.
* У легендзе да дыяграмы ў адказах рэспандэнтаў захаваная аўтарская арфаграфія.

І далей наконт ацэначнага ўспрыняцця мовы зумерамі. У пытанні “Чаму, на вашу думку, беларусы масава не пераходзяць на беларускую” толькі 3 чалавекі абралі варыянт “саромеюцца, бо размаўляць па-беларуску зашкварна”, які трансляваў яшчэ савецкія ярлыкі “адсталасці”, “калгаснасці” ці “вясковасці” мовы (гл. малюнак 13).

Можна меркаваць, што сучасныя маладыя людзі не перанялі гэтых стэрэатыпаў ад старэйшых, 80,6% лічаць, што прычына ў інерцыі – на рускай размаўляе пераважная большасць, і так гістарычна склалася, ці праз няведанне мовы – 9%.

У гэтым пытанні былі дзве асаблівасці: па-першае, яно было сфармулявана так, што рэспандэнт быў запрошаны адказаць за іншых, а не за сябе ўласна, так што ён ці яна як бы здымалі з сябе асабістую адказнасць, прадстаўляючы погляд на агульную тэндэнцыю як бы адстаронена, з боку; па-другое, тут яны маглі падаць сваю версію ў опцыі “Іншае”. Гэтую опцыю абралі агулам 4 рэспандэнты. Іх адказы: “Лянота”, “Не хочуць выдзяляцца”, “Адчуваюць ціск з боку розных устаноў”, “З дзяцінства прывыклі і пераходзіць на іншую мову цяжка”. І ў гэтых адказах толькі адзін спасылаецца на вонкавыя абставіны, на ціск у грамадстве. Астатнія пра тое, што пераход на беларускую патрабуе асабістых намаганняў, працы, пераадолення і выйсця з зоны камфорту, на што большасць пакуль не гатовыя. Аднак я б не акрэслівала пакаленне зумераў як выключна прагматычнае. Усё-ткі разуменне сваёй нацыянальнай адметнасці і важнасці ролі мовы ў працэсе захавання сваёй ідэнтычнасці ёсць у большасці апытаных. Гэта можна бачыць па варыянтах адказаў на пытанне “Калі вы завялі блог па-беларуску, то гэта найхутчэй таму што...” (гл. малюнак 14).

42 рэспандэнты з 67-мі, што складае 62,7%, завядуць блог па-беларуску з патрыятычных меркаванняў, амаль 15% – таму што прыцягнуць патрэбную аўдыторыю (тут можна выказаць меркаванне, што “патрэбная” – гэта нацыянальна арыентаваная, тыя, каму цікава спажываць беларускамоўны кантэнт, і для 10 рэспандэнтаў такая мэтавая аўдыторыя выглядае прывабна). Толькі 4 чалавекі

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02



Малюнак 14.

лічаць, што беларуская мова ў сацсетках зараз у трэндзе і выдзяляе блог з масы падобных. 11 прызналіся ў тым, што ніколі не завядуць блог па-беларуску. Гэта 16,4% супраць 83,6% патэнцыйна гатовых рабіць беларускамоўны кантэнт у публічнай прасторы.

Адметна і тое, што прадстаўнікі фокус-групы заўважылі, як апошнім часам колькасць беларускамоўнай моладзі павялічылася (так адказалі 40,3%) ці, прынамсі, іх не стала меней (так адказала 44,8%), што бачна на малюнку 15.

Яшчэ адно пытанне было пра тое, дзе прасцей перайсці зараз на беларускую. Цікава, што амаль 60% лічаць, што прасцей гэта зрабіць у вёсцы, бо там старэйшае пакаленне размаўляе па-беларуску ці на дыялекце. У гэтым можна ўбачыць уяўленне маладых людзей пра тое, што засваенне мовы патрабуе пагружэння ў аўтахтоннае моўнае асяроддзе, пераемнасці і досведу камунікацыі з "настаўнікамі" (гл. малюнак 16).

Ужо завяршыўшы апытанне, я зразумела, што ў ім бракавала важнага пытання пра стаўленне аўдыторыі да чысціні мовы і памылак. Відаць, гэта варта асобнага даследавання, бо, паводле маіх назіранняў за кантэнтам ў TikTok і Instagram, сучаснае пакаленне амаль пазбавілася яшчэ аднаго стэрэатыпу "або выдатна, або ніяк". Яны не саромеюцца размаўляць на трасянцы ці на іншым варыянце змешанага маўлення (напрыклад, #надеждасюмором з Гродна) або



Малюнак 15.

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02



Малюнак 16.

прасоўваюць свой дыялект (#flawless.kate з Альшанаў). Некаторыя намагаюцца рабіць кантэнт на літаратурнай мове, але без комплексаў ставяцца да памылак і дазваляюць іх сабе (#alesita.by пра штодзённасць). Як настаўніца мовы, гляджу на гэта станоўча. Боязь памыліцца перашкаджае развіццю і руху наперад.

Праведзенае апытанне маладой беларускай аўдыторыі 16–20 гадоў дае каштоўны матэрыял для далейшых роздумаў. Безумоўна, 67 анкет – гэта адносна невялікая колькасць для падобнага даследавання, таму і высновы камусьці могуць падацца недастаткова важкімі. Але нагадаю важны момант: зараз правесці анкетаванне ў класе школы ці ва ўніверсітэцкай аўдыторыі на занятках немагчыма. Мае рэспандэнты паўдзельнічалі ў апытанні добраахвотна, па ўласнай ініцыятыве, не таму, што гэта трэба, а хутчэй таму, што гэта цікава. Зыходзячы з гэтага, можна меркаваць, што іх адказы максімальна ўзважаныя і адкрытыя. А той факт, што ў анкетаванні ўзялі ўдзел рэспандэнты з розных класаў і школ, розных гарадоў, што яны не былі знаёмыя паміж сабой, а значыць, не прэзентавалі нейкую адну аднародную сацыяльную групу (як, напрыклад, бывае ў выпадку анкетавання вучняў аднаго класа ці студэнтаў аднаго факультэта, дзе мову выкладае той самы выкладчык), дазваляе пабачыць даследаваную сітуацыю больш аб'ёмна.

Адказваючы на сфармуляваныя вышэй даследчыя пытанні, зазначым, што вынікі апытанкі сведчаць наўпрост аб тым, што ў жыцці зумераў беларуская мова ўсё яшчэ займае даволі заўважнае месца, нягледзячы на тое, што ўмовы для яе развіцця застаюцца, мякка кажучы, неспрыяльнымі. І хоць амаль 90 адсоткаў не размаўляе па-беларуску ў штодзённым жыцці, 22 адсоткі пераходзяць на беларускую ў камунікацыі з беларускамоўнымі сябрамі, што кажа пра тое, што яны ставяцца да пазіцыі сяброў цалкам прыязна і нават гатовыя актыўна іх падтрымліваць. Таксама станоўча можна ацаніць тое, што моладзь разумее, як беларуская мова ўплывае на рускую ў нашым асяроддзі і як адбываецца моўная інтэрферэнцыя. Так, трохі больш за 13 адсоткаў апытаных сказалі, што дома размаўляюць на трасянцы. Натуральна, мы з імі не дамаўляліся па тэрміналогіі, таму невядома, што менавіта яны мелі на ўвазе пад трасянкай – ці то рускую

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02

мову з беларускімі словамі і выразамі, ці то беларускую з русізмамі, аднак прынамсі зразумела, што зумеры заўважаюць змешаныя формы маўлення, а не толькі літаратурныя. Даволі аптымістычна выглядае і тое, што ў большасці апытаных – у амаль 75 адсоткаў – ёсць беларускамоўныя сябры (а ў 15 адсоткаў іх нават болей за два) і што чуюць яны мову не толькі на занятках, але і ў гарадскім асяроддзі ды ў віртуальнай рэчаіснасці сацыяльных сетак. Гэта трохі "хістае" ўстойлівае песімістычнае меркаванне пра паступовае і немінучае згасанне беларускай мовы і загрозу яе знікнення, што бытуе сярод прадстаўнікоў старэйшага пакалення, скажам так, неабыякавых да лёсу беларушчыны людзей. Нягледзячы на іх занепакоенасць, маладыя людзі працягваюць вучыць мову (больш за 65 адсоткаў рэспандэнтаў лічаць, што ведаюць яе добра і здольны самастойна ствараць на ёй тэксты). І пры ўсёй прагматычнасці сучаснага пакалення зумераў, яны адчуваюць важнасць і вартасць захавання ды прасоўвання нацыянальнай мовы, таму гатовыя папулярызаваць яе ў сацыяльных сетках не толькі шляхам падтрымкі чужога беларускамоўнага кантэнту. 83,6% апытаных патэнцыйна разглядаюць магчымасць весці свой блог на беларускай мове па розных прычынах, што ўражвае. Гэта сведчыць, што сучасная моладзь не бачыць для выкарыстання мовы ў публічнай віртуальнай прасторы ніякіх перашкод. І бадай самая важная выснова з прааналізаваных адказаў: новае пакаленне паступова разрывае старое кола шкодных стэрэатыпаў і пачынае глядзець на беларускую мову без комплексу непаўнавартасці. Амаль ніхто з апытаных не думае, што беларусы ў наш час не размаўляюць па-беларуску, бо гэта сорамна. Лічбавае пакаленне мае бязмежныя магчымасці атрымання самай разнастайнай інфармацыі, што спрыяе сціранню граніц і абмежаванняў. З іх пункту погляду, усё, што аддзяляе нас ад шырокага распаўсюджання мовы ў штодзённай камунікацыі, гэта звычка карыстацца рускай (тое, што яны прынялі ў спадчыну як дадзенасць) і адсутнасць "матэрыяльна выяўленай" матывацыі пераходзіць на беларускую (навошта пераходзіць, калі ва ўсіх сферах грамадства дамінуе руская).

Аднак не варта ўспрымаць гэтыя высновы і занадта аптымістычна. Сітуацыя з беларускай мовай унутры краіны застаецца ведьмі складанай, але нельга ўсё ж не заўважаць і таго, што дзякуючы лічбаваму пакаленню яна зараз можа існаваць і развівацца ў новым вымярэнні, мяняючы ці адмяняючы старыя схемы і ствараючы новыя формы маўленчай рэчаіснасці.

REFERENCES / BIBLIOGRAFIA

Kuznecova, Ariadna. (2000). Starye sociolingvističeskie materialy i vozmožnostʹ ih novogo pročteniâ (k voprosu ob izmenenii interpretacij v sociolingvistike). U: Vida Mihalʹčenko (red.). *Âzyki RF i novogo zarubežʹâ: status i funkcii* (s. 18–33). Moskva: Èditorial

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02

URSS. [Кузнецова, Ариадна. (2000). Старые социолингвистические материалы и возможность их нового прочтения (к вопросу об изменении интерпретаций в социолингвистике). У: Вида Михальченко (ред.). *Языки РФ и нового зарубежья: статус и функции* (с. 18–33). Москва: Эдиториал УРСС].

Lânkevìč, Alena. (2014). *Belaruskaâ mova ì zmešanyâ kody ŭ sacyâlìngvìstyčnym ì psìhalìngvìstyčnym aspektah: katègoryâ adnosìn da movy ŭgramadstve*. (Dysertacyâ na atrymanne vučonaj stupenì kandydata fìlalagìčnyh navuk pa specyâl′nascì 10.02.01 – belaruskaâ mova, 10.02.19 – tèoryâ movy). Mìnsk. [Лянкевіч, Алена. (2014). *Беларуская мова і змешаныя коды ў сацыялінгвістычным і псіхалінгвістычным аспектах: катэгорыя адносін да мовы ў грамадстве*. (Дысертацыя на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.01 – беларуская мова, 10.02.19 – тэорыя мовы). Мінск].

Mâčkoŭskaâ, Nìna. (1998). Scìplae abaânne akadèmìzmu: sacyâlìngvìstyčnyâ matyvy na staronkah “Belaruskaj lìngvìstykì” (1986–1996). U: Mìkalaj Prygodzìč (rèd.). *Belaruskaâ mova ŭ drugoj palove XX stagoddzâ* (s. 73–77). Mìnsk: BGU, NANB. [Мячкоўская, Ніна. (1998). Сціплае абаянне акадэмізму: сацыялінгвістычныя матывы на старонках “Беларускай лінгвістыкі” (1986–1996). У: Мікалай Прыгодзіч (рэд.). *Беларуская мова ў другой палове XX стагоддзя*. (с. 73–77). Мінск: БДУ, НАНБ].

Mâčkoŭskaâ, Nìna. (2012). Narodnaâ lìngvìstyka ŭ belaruskìm ìntèrnèce: metamoŭnaâ rèfl eksìâ ì moŭnae samavyznačènne. U: Sârgej Zaprudskì, Genadz′ Cyhun (rèd.). *Novaeslova ŭ movaznaŭstve: matèryâly V Mìžnarodnaga kangrèsa belarusìstaŭ “Novae slova ŭ belarusìstycy” (20–21 maâ 2010 goda)* (s. 260–272). Mìnsk: Četyre četverti. [Мячкоўская, Ніна. (2012). Народная лінгвістыка ў беларускім інтэрнэце: метамоўная рэфлексія і моўнае самавызначэнне. Сяргей Запрудскі, Генадзь Цыхун (рэд.). *Новае слова ў мовазнаўстве: матэрыялы V Міжнароднага кангрэса беларусістаў “Новае слова ў беларусістыцы” (20–21 мая 2010 года)* (с. 260–272). Мінск: Четыре четверти].

Mel′nikova, Larisa. (2007). Nekotorye aspekty izučeniâ âzykovoj situacii g. Minska. U: Lûdmila Čumak (red.). *Âzyk i socium. Materialy VII Meždunar. naučˇ. konf., g. Minsk, 1–2 dekabrâ 2006 g.*, č. 1 (s. 64–67). Minsk: RIVŠ [Мельникова, Лариса. (2007). Некоторые аспекты изучения языковой ситуации г. Минска. У: Людмила Чумак (ред.). *Язык и социум: Материалы VII Междунар. науч. конф., г. Минск, 1–2 декабря 2006 г.*, ч. 1 (с. 64–67). Минск: РИВШ].

Paŭloŭskaâ, Taccâna. (2008). *Sučasnaâ maŭlenčaâ sìtuacyâ ŭ belaruskìm goradze (Baranavìčy): sacyâlìngvìstyčny aspekt* [Aŭtarèferat dysertacyì na atrymanne vučonaj stupenì kandydata fìlalagìčnyh navuk pa specyâl′nascì 10.02.19 – tèoryâ movy]. Mìnsk. [Паўлоўская, Таццяна (2008). *Сучасная маўленчая сітуацыя ў беларускім горадзе (Баранавічы): сацыялінгвістычны аспект* [Аўтарэферат дысертацыі на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук па спецыяльнасці 10.02.19 – тэорыя мовы]. Мінск].

Tokc′, Sârgej. (2018). Dynamìka nacyânal′na-moŭnaga skladu nasel′nìctva Belarusì ŭ drugoj palove XX – pačatku XXI stagoddzâ. U: *Sacyâl'na-palìtyčnyâ ì nacyânal'na-kanfesìjnyâ transfarmacyì ŭ Belarusì (kanec XIX – pačatak XXI stst.)* (s. 41–56). Mìnsk: BÌP. [Токць, Сяргей. (2018). Дынаміка нацыянальна-моўнага складу насельніцтва Беларусі ў другой палове XX – пачатку XXI стагоддзя. У: *Сацыяльна-палітычныя і нацыянальна-канфесійныя трансфармацыі ў Беларусі (канец XIX – пачатак XXI стст.)* (с. 41–56). Мінск: БІП].

Woolhiser, Curt. (2013). New Speakers of Belarusian: Metalinguistic Discourse, Social Identity and Language Use. In: David M. Bethea and Christina Y. Bethin (eds.), *American*

Pobrane z czasopisma Studia Bia?orutenistyczne **http://bialorutenistyka.umcs.pl**
Data: 01/11/2026 03:29:02

Contributions to the 15th International Congress of Slavists, Minsk, August 2013 (pp. 63–115). Slavica, Bloomington, Indiana.

Zakon Rèspublìkì Belarus′ *Ab abarone persanal'nyh danyh* ad maâ 2021 g. Nr 99–З. [Закон Рэспублікі Беларусь *Аб абароне персанальных даных* ад мая 2021 г. № 99–З].

Zaprudskì, Sârgej; Laŭžal′, Genadz′. (1998). Sub'ektyŭnaâ ètnamoŭnaâ žyccëvasc′ ì ètnìčnaâ ìdèntyfikacyâ. U: Mìkalaj Prygodzìč (rèd.). *Belaruskaâ mova ŭ drugoj palove XX stagoddzâ* (s. 56–60). Mìnsk: BDU, NANB. [Запрудскі, Сяргей; Лаўжаль, Генадзь. (1998). Суб'ектыўная этнамоўная жыццёвасць і этнічная ідэнтыфікацыя. У: Мікалай Прыгодзіч (рэд.). *Беларуская мова ў другой палове XX стагоддзя* (с. 56–60). Мінск: БДУ, НАНБ].

SUBMITTED: 2025.06.29
ACCEPTED: 2025.10.06
PUBLISHED ONLINE: 2026.01.30

ABOUT THE AUTHOR / O AUTORZE

Nadzieja Shakun / Надзея Шакун – Białoruś, badaczka niezależna, doktor filologii; *specjalność*: językoznawstwo; *zainteresowania naukowe*: historia piśmiennictwa na Białorusi, współczesny język białoruski w mediach, literaturze oraz szkolnictwie ponadpodstawowym.

W kontakcie pośredniczy redakcja – adres: Plac Marii Curie-Skłodowskiej 4A, 20-031 Lublin, Polska

Wybrane publikacje:

1. Шакун, Надзея. (2000). Кірыла-мяфодзіеўская моўная традыцыя на паграніччах (Тураўскае Евангелле і Супрасльскі рукапіс). W: Jan Franciszek Nosowicz (red.). *Dziedzictwo związków językowych, literackich i kulturowych polsko-bałto-wschodniosłowiańskich. Kultura i literatura*, t. IV: *Kultura i literatura* (s. 273–276). Białystok: Uniwersytet w Białymstoku. Zakład Bibliotekoznawstwa.
2. Шакун, Надзея. (2006). Кірыла-мяфодзіеўская традыцыя на Тураўшчыне ў XI–XVI стст.: праблемы даследавання і тэрміналогіі. У: *Слов'янський збірник*, XII (с. 16–26). Одеса: ОРІДУ НАДУ.
3. Шакун, Надзея. (2010). Туровские евангелия в литовских библиотечных фондах. In: *Žmogus Kalbos erdvėje*. Nr 6: *Mokslinių straipsnių rinkinys* (pp. 204–210). Kaunas: Vilniaus universiteto Kauno humanitarinis fakultetas.
4. Шакун, Надзея. (2015). Проблемы исследования кирилло-мефодиевского наследия в белорусских говорах. In: *VALODA-2015. Dažādu kultūru kontekstā. Zinātnisko rakstu krājums XXV* " (pp. 66–72). Daugavpils: Daugavpils Universitātes Akadēmiskais apgāds "Saule".
5. Шакун, Надзея. (2018). Да пытання пра царкоўнаславянізмы ў беларускіх дыялектах. *Slavistica Vilnensis*, 63, с. 227–240.